


ранскага сельсавета — 256 м. Ніжэйшая адзнака — урэз р. Улы (урэз вады — лінія перасячэння воднай паверхні ракі з паверхняй сушы) на Пн за в. Дзямідавічы на мяжы з Бешанковіцкім раёнам — 122 м.

Большую частку раёна займае Чашніцкая раўніна, якая працягваецца на Пд частцы Бешанковіцкага і на Пн і ПнЗ частцы Сенненскага раёнаў. Чашніцкая раўніна ўваходзіць у акругу Беларускага Паазер'я. Мяжуе з Полацкай нізінай на Пн, Віцебскім узвышшам на ПнУ, Лучоскай нізінай на У, Аршанскім узвышшам на Пд, Верхнебярэзінскай нізінай на ПдЗ і З. Найбольшая вышыня Чашніцкай раўніны на Пд — 192 м над узроўнем мора. Плошча каля 2,5 тыс. км$^2$, працягласць з З на У 40—72 км, з Пн на Пд 30—70 км.

Пераважаюць марэнныя чырвона-бурыя суглінкі, сустракаюцца супясчаныя адклады з вялікай колькасцю валуноў. У цэнтры раўніны найбольш затарфаваная катлавіна каля воз. Жэрынскае. Па раўніне ў межах раёна цячэ Ула з прытокамі Усвейка і Лукомка, якія адносяцца да басейна Заходняй Дзвіны. Ёсць мноства азёр, буйнейшае з якіх Жэрынскае. Лясістасць раўніны 30 % — сасннякі на ўзго-